# Жывая вада для Ельні.

УЗАКАЗНІКУ "Ельня», што на тэрыторыі Міёрскага і Шаркоўшчынскага раёнаў, знаходзіцца адно з найбуйнейшых верхавых балот, якое мае плошчу больш за 200 квадратных кіламетраў. Нягледзячы на свой прыродаахоўны статус, маштабная меліярацыя мінулага стагоддзя істотна «патрапала» цудоўную прыроду гэтага балота. Будаўніцтва дзясяткаў каналаў і выраўноўванне рэк прывялі да істотнага зніжэння ўзроўню грунтовых водаў, а гэта ў сваю чаргу — да частых і буйных пажараў на балоце. У выніку апошняга пажару ў 2002 годзе было знішчана больш як 70 працэнтаў балота. Агонь і нізкі ўзровень грунтовых водаў маглі цапкам «разбурыць» унікальную экасістэму беларускага балота. Толькі эканамічныя страты ад выгарання журавінных “палёў” складаюць сёння больш як 100 мільёнаў рублёў у год. Каб захаваць балота для нашчадкаў, грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны» разам з адміністрацыяй заказніка «Ельня» ініцыявалі праект па аднаўленні гідралагічнага рэжыму цэнтральнай часткі балота. Па гэтым праекце летась на тэрыторыі заказніка сіламі Міёрскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм быў пабудаваны шэраг пераліўных плацін на галоўных вадасцёках цэнтральнай часткі балота.

Дырэктар ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Віктар Фенчук паведаміў рэдакцыі, што на працягу двух гадоў у аднаўленні гідралагічнага рэжыму балота Ельня ўдзельнічалі і спецыялісты АПБ. Падчас 12 валанцёрскіх лагераў, якія часткова фінансаваліся ЗП «Кока-кола Беверннджыс Беларусія», пабудавана каля 30 плацін з мясцовых матэрыял аў — гарэлых ствалоў дрэў і торфу. Усяго на будаўніцтве плацін бралі ўдзел больш як 100 чалавек з усіх куткоў Беларуси.

Нагадаю, што балота Ельня абвешчана ландшафтным заказнікам рэспубліканскага значэння, тэрыторыяй, важнай для птушак міжнароднага значэння, і Рамсарскім угоддзем. Тут жыве 98 відаў птушак, з якіх 23 занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, расце 11 рэдкіх відаў раслін, у тым ліку карлікавая бяроза і марошка. Балотны масіў Ельня мае вялікае значэнме ў якасці прыпынку мігруючых гусей і жураўлеў па веснавых і восеньскіх пралётах.

**Источник:** Звязда.-2010.-3 лют.-С.3